# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі
Мурашкі Наталлі Уладзіміраўны
"Мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя
сродкамі фальклору на І ступені агульнай сярэдняй
адукацыі", прадстаўленай на саісканне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.02 –
тэорыя і методыка навучання і выхавання (вучнёўскай і
студэнцкай моладзі)

Народная творчасць з'яўляецца каштоўнай крыніцай спасціжэння спосабаў і форм асваення навакольнай рэчаіснасці чалавекам, сродкам захавання і трансляцыі сацыяльных і мастацкіх каштоўнасцей, вылучаных і прынятых грамадствам на працягу гістарычнай эвалюцыі духоўных ідэалаў. Адлюстроўваючы светапогляд народа, фальклор у сінкрэтызме вусна-паэтычнай творчасці і сістэмы рытуальных дзеянняў увасабляе і выражае адметнасць мыслення, спецыфіку вераванняў і перакананняў, стаўленне да жыццёвых сітуацый чалавека і грамадства пэўнага рэгіёну. Менавіта адметнае ў народнай творчасці, што выяўляецца ў тэхнічных прыёмах рэпрэзентацыі карціны свету, семантыцы ўзаемазвязаных элементаў абрадавых дзеянняў, вербальных і невербальных сродках камунікацыі, служыць маркерам самаідэнтыфікацыі нацыі.

Вывучэнне фальклору на ўроках і ў пазакласнай дзейнасці вучнёўскай моладдзю дазваляе здзейсніць падарожжа па вехах гісторыі краю, акунуцца ў атмасферу побыту народа, "дакрануцца" да рэалій рэчаіснасці ў паўсядзённым жыцці чалавека. Народныя песні і танцы, загадкі і прыказкі, гульні, забавы і абрадавыя дзеянні адкрываюць магчымасць у кантэксце адукацыйнага асяроддзя адчуць спецыфіку арганізацыі працы і дасугавай дзейнасці беларусаў. У лічбавую эпоху, патрабаванні якой уносяць карэктывы ў арганізацыю камунікатыўных працэсаў, фальклор застаецца запатрабаванай формай і дзейсным сродкам спазнання гістарычнага мінулага, фіксаванага ў аб'ектах нематэрыяльнай спадчыны. Фальклор дае магчымасць трансляцыі ва ўмовах актыўнага/інтэрактыўнага асяроддзя дадзеных і метададзеных аб жыццядзейнасці грамадства ў гістарычным кантэксце, што выражаюцца мовай – вуснай і пісьмовай, маляўнічай і пластычнай. Адзначанае актуалізуе тэму дысертацыі Н. У. Мурашкі.

Дысертацыйнае даследаванне Наталлі Уладзіміраўны Мурашкі з'яўляецца першай у айчыннай педагогіцы навуковай работай, прысвечанай праблеме мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору і арыентуецца на развіццё камунікатыўнай культуры вучняў малодшага школьнага ўзросту (на аснове вербальных спосабаў зносін на беларускай мове). Для раскрыцця праблемы даследавання Н. У. Мурашка ўдакладняе сутнасць паняцця "маўленчае адукацыйнае асяроддзе", раскрывае яго структуру з пазіцый педагогікі, псіхалогіі, філасофіі, лінгвістыкі. У дысертацыі выяўляецца педагагічны патэнцыял фальклору ў мадэляванні маўленчага адукацыйнага

асяроддзя ў кантэксце развіцця камунікатыўнай культуры малодшых школьнікаў у адзінстве трох аспектаў: мэтавага, змястоўнага, дзейнаснага. Фарміраванне доказнай базы ажыццяўляецца з апорай на прапанаваную аўтарам педагагічную мадэль стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, пабудаваную па прынцыпе структурна-функцыянальнай арганізацыі блокаў-кампанентаў. Прэзентуецца модульная методыка фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў 1–4 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі праз вывучэнне фальклору ў адзінстве аналітыка-дыягнастычнага, змястоўна-дзейнаснага і рэсурсна-падтрымліваючага кампанентаў (модуляў).

Дысертацыя Мурашкі Наталлі Уладзіміраўны “Мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі” мае практыкаарыентаваны характар і ўтрымлівае рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў даследавання ў адукацыйным працэсе на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў школах з рускай мовай навучання і выхавання (пацверджана пяццю актамі аб укараненні вынікаў).

Структурна-лагічная будова дысертацыі адказвае заяўленай тэме. Прадстаўленая да абароны работа складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, двух раздзелаў, заключэння, у якім падводзяцца вынікі даследавання, бібліяграфічнага спісу і дадаткаў.

Матэрыялы і вынікі даследавання атрымалі апрабацыю на міжнародных навукова-практычных канферэнцыях. Апублікаванасць вынікаў даследавання ўяўляецца дастатковай (6 артыкулаў у навуковых часопісах, уключаных у пералік ВАК, 2 артыкулы ў навуковых часопісах, 11 артыкулаў у зборніках матэрыялаў навукова-практычных канферэнцый, 2 метадычныя дапаможнікі) і адпавядае спецыяльнасці.

Пры несумненных вартасцях работы існуюць заўвагі:

1. У аналізе аспектаў звароту да фальклору адсутнічаюць спасылкі на даследаванні А. Ю. Лозкі, А. Г. Алфёравай, М. А. Шатаравай, Н. Г. Мазурынай, якія бы ўзмацнілі тэарэтычную базу даследавання.

2. Немагчыма пагадзіцца з дысертантам у трактоўцы паняцця “маўленчае адукацыйнае асяроддзе”, якое інтэрпрэтуецца як “комплекс умоў і мерапрыемстваў, спецыяльна сканструяваных у навучальнай установе, накіраваных на ўзнаўленне натуральнага моўнага асяроддзя і фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі як якаснага паказчыка маўленчай і камунікатыўнай дзейнасці малодшых школьнікаў” (палажэнне 1, с. 4 аўтарэферата). Асяроддзе (адукацыйнае ці іншае – мастацкае, архітэктурнае, творчае і г. д.) само па сабе ўяўляе прастору арганізацыі і функцыянавання суб’ект-суб’ектных ці суб’ект-аб’ектных узаемаадносін. Аўтар жа акцэнтуе сутнасць маўленчага адукацыйнага асяроддзя на педагагічных умовах, што спрыяюць эфектыўнасці яго развіцця. Аднак на с. 9 аўтарэферата аўтар слушна сцвярджэае, што “маўленчае асяроддзе разглядаюць як акружэнне, у якім адбываецца вывучэнне мовы, і падзяляюць на натуральнае ці штучнае, якое

ствараецца непасрэдна на занятках з дапамогай розных сродкаў навучання і з’яўляецца прадуктам дзейнасці настаўніка”.

Сцвярджэнне аб тым, што “для функцыянавання маўленчага адукацыйнага асяроддзя неабходна стварыць такія ўмовы, якія б забяспечвалі інфарматыўнае акружэнне вучняў з пастаянным функцыянаваннем беларускай мовы” (с. 10 аўтарэферата) з’яўляецца таўталагічным, бо само “маўленчае адукацыйнае асяроддзе” разумеецца аўтарам як комплекс умоў. У такім варыянце непрымальны сэнс фразы аб тым, што для функцыянавання комплекса ўмоў неабходны ўмовы…

3. У аўтарэфераце сустракаецца недакладнасць у выкарыстанні блізкіх па сэнсе тэрмінаў, якія трэба было размежаваць: “маўленчая дзейнасць” (с. 11, 13, 17), “камунікатыўная дзейнасць” (с. 13, 17), “маўленча-камунікатыўная дзейнасць” (с. 11).

Адзначаныя заўвагі не зніжаюць значнасць праведзенага даследавання і не ўплываюць на высокую яго ацэнку.

Дысертацыя Мурашкі Наталлі Уладзіміраўны “Мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі” з’яўляецца арыгінальным даследаваннем, цалкам адпавядае патрабаванням, што прад’яўляюцца да кандыдацкіх дысертацый адпаведнай навуковай галіны. Аўтар заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання (вучнёўскай і студэнцкай моладзі).

Загадчык кафедры тэорыі і методыкі
выкладання мастацтва ўстановы адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны
ўніверсітэт імя Максіма Танка”,
доктар мастацтвазнаўства, прафесар Ю.Ю. Захарына

Подпіс Ю.Ю. Захарына
сведчу: начальнік АК БДПУ
07.10.2025